*В. У. Чэчат,*
*загадчык аддзялення праблем выхавання БелНДІ адукацыі, кандыдат педагагічных навук*

# Педагог Гарбачэўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да гэтага часу мы вельмі мала знаёмы з І. Д. Гарбачэўскім. Не пашыраюць нашых ведаў і звесткі, пададзеныя ў Беларускай энцыклапедыі: "Гарбачэўскі Іван Данілавіч (гады нараджэння і смерці невядомыя), беларускі краязнавец, этнограф і фалькларыст канца XIX ст. (Мн., 1971. Т III. — С. 357).

Але ў апошнія гады яго імя ўсё часцей прыцягвае ўвагу вучоных. Так, у невялікім паведамленні "Удалечыні ад Радзімы", змешчаным пад рубрыкай "Вернуты з забыцця" ("Настаўніцкая газета" ад 5 чэрвеня 1991 г.), навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь В. Скідан апавядае, што І. Д. Гарбачэўскі нарадзіўся ў 1860 г. у сялянскай сям'і, закончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю і Віленскі настаўніцкі інстытут, працаваў у Далыскім народным вучылішчы (Невельскі павет Віцебскай губерні), у Віцебску, Невелі, Рагачове.

З Беларускай энцыклапедыі, а таксама і з іншых крыніц даведваемся яшчэ і пра тое, што ён выкладаў рускую мову і гісторыю ў Невельскім павятовым вучылішчы. Адначасова І. Д. Гарбачэўскі цікавіўся гісторыяй, фальклорам, побытам беларусаў. У газеце "Витебские губернские ведомости" былі надрукаваны яго артыкулы "Зямля і араты" (1894), "Старажытнасць беларускіх песень і іх напеваў" (1896). Вядомыя таксама і працы "Аб волаках Вялікага воднага шляху з вараг у грэкі" (Віцебск, 1894), "Лепельскі павет Віцебскай губерні" (Віцебск, 1895).

І. Д. Гарбачэўскі быў і знакамітым педагогам. Працу настаўніка ён лічыў сваёй асноўнай прафесіяй. У 1894 г. вучонага абралі правадзей-

ным членам Педагагічнага таварыства імя Я. А. Коменскага пры Педагагічным музеі ў Пецярбургу.

З публіцыстычнымі артыкуламі па найбольш злабадзённых праблемах І. Д. Гарбачэўскі выступае і ў 90-ых гадах. Сярод яго педагагічных публікацый асабліваe месца займае цікавая праца "Сельскі настаўнік", якая ўпершыню была надрукавана ў газеце "Витебские губернские ведомости" (1895). У ёй аўтар не толькі дзеліцца з чытачамі сваімі педагагічнымі поглядамі, але і цікава апавядае пра ўласны выключна каштоўны вопыт безумоўна таленавітага народнага настаўніка.

Старанны працаўнік, чалавек высокамаральны, які добра ведае жыццё народа, ён выхоўвае дзяцей,аказвае істотны ўплыў на іх бацькоў, ды і наогул на ўсё дарослае насельніцтва вёскі. Прыслухоўваюцца да парад настаўніка нават і тыя, хто закончыў школу 15 — 20 гадоў таму.

І. Д. Гарбачэўскі лічыў, што праца, клопаты пра захаванне навакольнай прыроды адыгрываюць асноўную ролю ў выхаванні дзіцяці. Гэтыя погляды ён імкнуўся рэалізаваць праз сістэму працоўнага навучання і выхавання хлопчыкаў і дзяўчынак. Думкі пра адзінства выхаваўчага ўздзеяння на дзяцей і бацькоў педагог выказаў у працы "Сельскі настаўнік". З імі будзе цікава пазнаёміцца і настаўнікам сучаснай сельскай школы.

* * *

## *І. Д. Гарбачэўскі*

# Сельскі настаўнік

## *(Віцебск, 1895)*

### (Урыўкі)

... Мікалай Іванавіч пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі быў прызначаны настаўнікам у беларускую вёску Г. Нягледзячы на тое, што яна стаяла ў лесе, хаты былі без комінаў, з землянымі падлогамі, маленькімі разбітымі акенцамі і хутчэй нагадвалі хлявы, чым жыллё людзей. Двары стаялі без варот і плотаў. На агародах цяжка было знайсці нешта падобнае на сапраўдную агародніну...

... Летам сяляне яшчэ знаходзілі сабе сякую-такую працу. Але з надыходам зімы яны не ведалі, чым заняцца, і адводзілі душу ў шынку, дзе прапівалі апошняе. Муж краў у жонкі, жонка ў мужа, усё цягнулася



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да шынкара і праменьвалася на гарэлку. Дзеці пераймалі гэтыя звычкі ў бацькоў, напіваліся і брыдкасловілі не горш за дарослых...

... Цяжка апісаць той бруд, беднасць, ляноту і разбэшчанасць, што ўбачыў малады настаўнік сярод жыхароў вёскі Г. Але яго больш за ўсё засмучала тое, што сяляне зусім не хацелі аддаваць сваіх дзяцей у вучылішча...

... Аднак Мікалай Іванавіч любіў сваю справу, не апусціў рук і адразу ўзяўся за навучанне і выхаванне маленькіх дзікуноў. Ён добра разумеў, што народная школа павінна вучыць дзяцей грамаце і разам з тым распаўсюджваць сярод народа веды аб рацыянальным вядзенні гаспадаркі з яе найважнейшымі галінамі. Мікалай Іванавіч завёў пры вучылішчы гаспадарку, сад, агарод, некалькі вулляў пчол...

Наталля Афанасеўна заўсёды казала свайму мужу, што пісьменнасць на вёсцы карысная і жанчынам, бо мужчыны зусім не займаюцца выхаваннем дзяцей, а пісьменная маці пастараецца правільна выхаваць сваіх дзяцей. Зыходзячы з гэтай ідэі, яна пачала прываблівадь да вучылішча дзяўчынак і разам з граматай вучыць іх рукадзеллю, кухоннай справе, дамаводству, правільнаму догляду за маленькімі дзецьмі. Спачатку справы ішлі цяжка, вучаніц было вельмі мала, але нарэшце жанчыны ўбачылі карысць навучання і пачалі ахвотна пасылаць дачок у школу. Яны ўсё часцей і часцей пачалі прыходзіць у школу самі і прыглядацца, што там робіцца. Гэта значна зблізіла школу з вёскай. З наступленнем вясны жанчыны ўжо пачалі прасіць настаўніцу даць ім насенне і растлумачыць, як яго сеяць, потым даглядаць, каб атрымаць такую ж добрую агародніну, якая расце на агародзе вучылішча...

... Мікалай Іванавіч завёў гадавальнік пладовых дрэў: яблынь, груш, сліў, вішань і ягадных кустоў і пачаў вучыць дзяцей садоўніцтву і агародніцтву. Справу ён вёў такім чынам. Восенню вучні збіралі насенне. Калі ж пачыналіся заняткі, то настаўнік з удзелам вучняў рыхтаваў для сяўбы зямлю, сеяў насенне і потым усю засеяную плошчу дзяліў на ўчасткі па колькасці вучняў і даручаў кожнаму з іх даглядаць адзін з участкаў. Пад непасрэдным кіраўніцтвам настаўніка дзеці палолі, акопвалі дрэўцы. Калі надыходзіў час, дзеці рабілі прышчэпванні і перасаджвалі дрэўцы ў школьны сад. Вучні з вялікай ахвотай вывучалі садоўніцтва і агародніцтва на практыцы. Нават у летні перыяд у свабодны ад хатняй працы час хлопчыкі прыбягалі ў вучылішча, старанна і рупліва даглядалі свае ўчасткі. За гэтую працу была своеасаблівая ўзнагарода: пасля заканчэння вучылішча кожны вучань атрымліваў ад настаўніка добрую палову выгадаваных ім маладых саджанцаў для таго, каб пасадзіць іх у сябе дома. Дзякуючы гэтаму ў акрузе рэдка ў якой вёсцы не было некалькі маладых садзікаў. З пчалярствам вучні таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

знаёміліся ў вучылішчы на практыцы і потым імкнуліся ўзяць на завод вулей пчол. І ў гэтым выпадку на выручку сваім вучням прыходзіў клапатлівы настаўнік і лепшым з іх даваў рой пчол, якіх у апошні час адсыпала больш, чым ён мог змясціць у сваім пчальніку.

Да ўсяго трэба дадаць і тое, што Мікалай Іванавіч ведаў паўтузіны рамёстваў, працаваў сам і прывучаў да рамёстваў вучняў. Амаль кожны дзень пасля заканчэння класных заняткаў у майстэрні настаўніка да позняга вечара раздаваўся стук сякеры і вішчанне піл...

... Уся мэбля вучылішча выраблялася і рамантавалася ў сваёй майстэрні. Старэйшыя вучні рабілі таксама рэчы і прадметы для хатняга ўжытку...

... Пры сустрэчах з суседнімі настаўнікамі Мікалай Іванавіч заўсёды даказваў ім, што народны настаўнік для здавальняючага выканання сваёй місіі разам з тым абавязкова павінен быць дасведчаным гаспадаром і рамеснікам, і што ён толькі тады зможа развіць у сваіх вучняў сапраўдную любоў да працы, калі асабіста пакажа ім прыклад працавітасці, калі з яго ўласных рук не будуць сыходзіць паважаныя мазалі. Гэта не было яму цяжка, наадварот, яго заўсёды будзе супакойваць думка аб тым, што ў недалёкай будучыні з усяго гэтага ён будзе мець асабістыя матэрыяльныя і маральныя выгоды.

*Head of Institute Department V.Chechet tells us about pedagogical ethnographical and folk-lore specialist I.D. Gorbachevski. The abstracts of his "Countryside tearcher" are given.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ